ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ІВАНА ШАМЯКІНА

# Глыбокі талент



**Багатую спадчыну пакінуў нам народны пісьменнік Беларусі Іван Пятровіч Шамякін. На яго творах вырасла не адно пакаленне беларусаў. Ён, пагадзіцеся, у свой час быў самым чытаемым аўтарам. «Глыбокая плынь», «У добры час», «Крыніцы», «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», «Петраград – Брэст», «Зеніт» – хто не помніць гэтыя раманы? А пенталогія «Трывожнае шчасце»? На творчым рахунку пісьменніка былі кнігі аповесцей і апавяданняў, п'есы. Той, хто сачыў за літаратурным працэсам 15–20 год назад, не мог не звярнуць увагі, што Іван Шамякін паранейшаму, не зважаючы на ўзрост, быў у выдатнай творчай форме – у друку адна за адной з'яўляліся яго новыя аповесці «Вернісаж», «Сатанінскі тур», «Падзенне», «Адна на падмостках», «Бумеранг», «Без пакаяння», раманы «Вялікая княгіня» і «Губернатар», іншыя значныя творы. Верны заставаўся ён і так званаму эпісталярнаму жанру – успамінам, якія сёння, калі пісьменніка ўжо амаль сем год няма з намі, набываюць неацэнную каштоўнасць. І не толькі для шчырых прыхільнікаў ягонай творчасці – для ўсіх! Цікава, як тыя ці іншыя гістарычныя падзеі, не кажучы ўжо пра асабістыя жыццёвыя калізіі, прапускаў Іван Шамякін праз сваё сэрца, праз свой тонкі пісьменніцкі розум і густ.**

Гэта быў пісьменнік глыбокага таленту.

Пішa, а дакладней сказаць, размаўляе Шамякін, вядзе непрымусовы дыялог з чытачом без гульні ў пиддаўкі. Не спявае, як той акын, пра ўсё, што бачыць, і толькі ў ружовых фарбах. Ён дае прынцыповую ацэнку падзеям, з'явам, часцей за ўсё – і людзям, нягай то першы сакратар ЦК КПБ, народны пісьменнік або яшчэ хто. Адным словам, называе рэчы сваімі імёнамі. Не ўсім такое падабалася. А ці трэба, даруйце, усім падабацца, бы начышчаны пятак? Ці трэба толькі дзеля гэтага спадзявання брацьу рукі гэблік, а? Ці трэба, увогуле, хлусіць? Перад самім сабой. Перад нашчадкамі, для якіх слова Івана Пятровіча будзе пульсаваць гаючай крыніцай доўгія гады.

Спыліся, яшчэ і як, калі помніце, на некаторыя ранейшыя публікацыі з цыкла «Пра час і пра сябе» Шамякіна папрокі за «скажэнне» тых ці іншых фактаў, выцягвалі пісьменніка нярадка і на дуэль. Ці прымаў ён тыя папрокі, ці пагаджаўся, перакрэсліваў адным махам напісанае – сказаць цяжка. Ён адмоўчваўся, не ўлазіў у перапалкі, рабіў гэта выключна ў самых неабходных момантах, таму можна было разумець маўчанне наступным чынам: гэта вам, родным і блізкім, так здаецца, бо для ўсіх вашы бацькі – класікі, самыя лепшыя людзі на свеце. А для мяне яны – такія... гэтакія... Даруйце. Кожны чалавек мае свае меркаванні, думкі, спакусы і гэтак далей.

Пра ўсё гэта мне думалася, калі перачытваў успаміны «Роздум на апошнім перагоне» – пашараныя дзённікавыя запісы. Яны вяртаюць нас на дваццаць гадоў назад. Афіцыйна. Калі меркаваць па даце, што стаіць пад імі. Але ж вяртаюць назад і на трыццаць, сорак гадоў, бывае, роўна як і вымушаюць зазірнуць у будучае. Што зробіш – за Шамякіным ідзеш надзвычай лёгка і ахвотна туды, куды ён вядзе цябе. Умее! І словам прывабіць, і думкай, і неабходным цікавым аповедам.

*«Захаваўся пачатак дзённіка за 1953 год – за 4 і 5 сакавіка – дні хваробы і смерці Сталіна,– прыгадвае Шамякін. – Дзённік я пачынаў і раней, ёсць, напрыклад, сшытак за 1952 год, першы запіс – радасць з нагоды таго, што скончыў «У добры час», што на стале не засталося ніводнай папкі з рукапісамі – аднёс у рэдакцыі, паслаў перакладчыку. Але дзённікі тых часоў кароткія: пачынаў новы раман, аповесць – і жыццяпіс уласны спыняўся. Аднак гэты запіс – «сталінскі» – самы кароткі, усяго за два дні. Усяго! І пра адно і тое ж – як мы плакалі «па вялікім і мудрым». Чаму такі кароткі запіс? Чаму я не працягваў свае перажыванні? Не было іх, перажыванняў? За два дні высахлі слёзы? Ці вельмі ж былі заняты ў пачатку «новай эры»? Не помню, каб былі нейкія асаблівыя падзеі, якія займалі б час і ўвагу сакратара партбюро. Звычайнае: жалобны мітынг, мітынг у падтрымку новага кіраўніцтва, які моцна абурыў Машу (яна гэта і зараз успамінае) – абурыў тым, што, не паспеўшы пахаваць Сталіна, пачалі славіць Маленкова. Асабліва вызначыўся Павел Кавалёў. Ды і Броўка. Во закамплексаванасць была! І памыліліся. Мікіта перайграў Малянкова. На шчасце. Цяпер я ўпэўнены, што захоп улады Маленковым ці Берыя прадоўжыў бы сталінскі дэспатызм. Хоць першыя паслясталінскія рэформы (асабліва на вёсцы) народ доўга звязваў з Малянковым – пасля таго, калі «кукурузная палітыка» Хрушчова правалілася. Хадзіла пагаворка: «Быў Малянкоў – паелі і блінкоў».*

*Безумоўна, тады я не так думаў – да 1957 года, калі Хрушчоў разграміў «антыпартыйную групу». Але ўнутрана, інтуітыўна я адчуваў, што далей так жыць нельга, што жыццё са смерцю Сталіна не спынілася. Наадварот, набыло іншы сэнс. Дапамагаў Андрэй, найбольш Андрэй (Макаёнак –* **аўт.***), хоць хутка цверазелі і іншыя мае калегі.*

*Запомніліся эпізоды ў дзень смерці Сталіна. Маша разбудзіла мяне ў шэсць гадзін раніцы з рыданнямі.*

*«Памёр...»*

*Я таксама заплакаў. Сапраўды, здалося, што свет перавернуўся, парушаны ўсе ўстоі, жыццё будзе рыцца, і мы ляцім у тартарары. Праз гадзіну мне пазванілі з рэдакцыі «Звязды» не з просьбай, з прапановай напісаць па свае пачуцці ў гэты трагічны час усенароднага гора. Я ў тыя гады лёгка пісаў барабанную публіцыстыку. Былі гатовыя штампы. У такой сітуацыі штампы не падыходзілі. Жалоба патрабавала іншага стылю, іншых слоў, а іх не было: мы многа пісалі пра вайну і не навучыліся пісаць пра смерць, сацрэалізм смерць узвышаў і паэтызаваў: загінуў за Радзіму, за Сталіна!*

*Мы жылі на першым паверсе, і прахожыя заглядвалі ў вокны майго кабінета. Жыў тады ў Мінску рускі паэт Дзмітрый Кавалёў, веткаўскі, мы з ім сябравалі з даваеннага часу – былі актыўнымі членамі літаб'яднання пры «Гомельскай праўдзе»: ён, Кастусь Кірэенка, Леанід Гаўрылаў былі нашымі кумірамі – іх ужо друкавалі не толькі ў Гомелі, але і ў Мінску. Пасля вайны мы зблізіліся яшчэ больш – землякі, і ваявалі ў адным месцы – Кавалёў быў маракам Паўночнага флоту. (Я напішу, як два сябры мае пасля аддаліі ад мяне гэтага чалавека).*

*Дзіма ў роспачы і горы ішоў да мяне ў такую рань паплакаць разам. Угледзеў праз акно, што я сяджу за сталом, пішу, і страшэнна абурыўся. Ускочыў у кватэру і ледзьве не кінуўся на мяне з кулакамі.*

*«Ты можаш пісаць у такі дзень! Ты знаеш, хто памёр!»*

***Іван Пятровіч Шамякін нарадзіўся***
***30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма До-***
***брушскага раёна Гомельскай вобласці.***
***Народны пісьменнік БССР (1972).***
***Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951)***
***за раман «Глыбокая плынь», Літаратурнай***
***прэміі імя Якуба Коласа (1959) за раман***
***«Крыніцы», Дзяржаўнай прэміі БССР імя***
***Якуба Коласа (1968) за раман «Сэрца***
***на далоні» і кнігу «Трывожнае шчасце»,***
***Літаратурнай прэміі Міністэрства аба-***
***роны СССР (1978) за кнігу «Гандлярка і***
***паэт. Шлюбная ноч», Дзяржаўнай прэміі***
***БССР у галіне тэатральнага мастацтва,***
***кінематаграфіі, радыё і тэлебачання (1982)***
***за кінафільм «Вазьму твой боль».***

*Цікава, што пасля XX з'езда Кавалёў стаў самым ваяўнічым антысталіністам, мала хто з паэтаў так скланяў «бацьку роднага», нават Еўтушэнка так не ўмеў, як імпульсіўны, гарачы марак Дзмітрый Кавалёў».*

Карысна сёння, несумненна, ведаць кожнаму беларусу сваю гісторыю. Без гісторыі няма будучыні. І шмат пра каго з тых, хто быў на алімпе, хто верхаводзіў, знаходжу цікавыя, на мой погляд, мясціны ў «Роздуме на апошнім перагоне». Што, напрыклад, уяўляў сабой першы сакратар ЦК Мікалай Сямёнавіч Патолічаў? Рускі, па агульным прызнанні – сумленны чалавек, ад сталінскай лініі ён не адступаў, але што тычыла ўнутрырэспубліканскіх гаспадарчых спраў, то вёў ён, прызнавалі ўсе, даволі незалежную палітыку. Ведаў прамысловасць, і яна расла небывалымі тэмпамі. З сельскай гаспадаркай не атрымлівалася. У культуру не лез: разбірайцеся, беларусы, самі. Але ў плане русіфікацыі не цісну, такіх акцый, як пазней зрабіў яго пераемнік К. Т. Мазураў, не рабіў: школы на рускую мову не пераводзіў.

Іван Шамякін дзеліцца сваімі ўспамінамі і ўражаннямі ад сустрэч з многімі цікавымі людзьмі, ён стварае іх, так бы мовіць, штрыхі-вобразы, але яны запамінаюцца, вымушаюць паглядзець на таго ці другога чалавека з іншага ракурсу. Беларус, былы сакратар ЦК КПСС і рэдактар газеты «Праўда» М. Зімянін, сакратар ЦК КПБ А. Кузьмін, камандзір партызанскага атрада Лемяшонак, апаратчыкі Абросімаў, Кляшчоў, Гарбуноў, пісьменнікі з Украіны Алесь Ганчар, Васіль Казачэнка, Мікола Нагнібяда, з Расіі Аляксандр Пракоф'еў, малдаванін Іван Чабану, латыш Гунар Цыруліс, нашы класікі Янка Брыль, Іван Мележ, Аркадзь Куляшоў, Пятро Глебка і іншыя шырока вядомыя людзі насяляюць успаміны Івана Шамякіна. І, вядома ж, даволі значнае месца ў нататках адводзіць пісьменнік легендарнай асобе – Пятру Міронавічу Машэраву, – шкадуе, што ў свой час не напісаў пра яго дакументальную аповесць, хаця і збіраўся, але не паспеў – апярэдзілі найбольш спрытныя і ўвішныя, хоць усю праўду пра Пятра Міронавіча ім сказаць не ўдалося.

Цікавасць выклікаюць і тыя старонкі «Роздуму на апошнім перагоне», дзе Іван Пятровіч разважае пра сваё месца ў літаратуры, пра нялёгкі шлях да прызнання, пра тыя шпількі, падножкі, што ставіліся – тактак, і яму таксама – дзяльцамі ад літаратуры. Здзіўляецеся? Не трэба! Таленавітым людзям заўсёды было цяжка, няпроста. Шамякін не быў выключэннем.

**Васіль ТКАЧОЎ.**

Фото shamyakin-goub.iatp.by.



Адкрыццё помніка Івану Шамякіну ў Мінску.